# РЕЦЕНЗИИ

***Багдановіч А.І. Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі Беларусі (1861–1900) / А.І. Багдановіч. – Мінск: БНТУ, 2012. – 153 с.***

## СУР'ЁЗНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ ВАЖНАГА АСПЕКТУ АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ

Рэцэнзіруемую кнігу, якую напісаў кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафеды "Гісторыя, сусветная і айчынная культура" Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Андрэй Іванавіч Багдановіч, можна аднесці да ліку прац, якія ўяўляюць сабой сур'ёзныя навуковыя даследаванні [1].

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца навуковае і культурна-асветніцкае жыццё Беларусі ў парэформенны перыяд 1861–1900 гадоў, працэсы і факты, якія характарызуюць яго стан. Прадметам даледавання – інтэлігенцыя і яе навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць у гэтыя гады [1, с. 4].

Кніга складаецца з уводзін, чатырох глаў, заключэння, літаратуры, дадаткаў. Рэцэнзент вырашыў вылучыць найбольш істотнае у кожным з пералічаных структурных кампанентаў.

Ва ўводзінах вычарпальна раскрыта актуальнасць тэмы даследавання. Менавіта тут А.І. Багдановіч грунтоўна разабраў лагічную структуру паняцця "інтэлігенцыя", сфармуляваў яго арыгінальнае і ў той жа час пераканаўчае разуменне. Гэта разуменне "дазволіла… больш-менш дакладна акрэсліць яе сацыяльны партрэт: вызначыць яе колькасць, прафесійны, сацыяльны, нацыянальны склад і адукацыйны ўзровень" [1, с. 8].

Першая глава называецца так: "Гістарыяграфія і крыніцы". Навукоўца на дастаткова высокім узроўні даследуе асноўныя этапы развіцця гістарыяграфіі праблемы, дае комплексны аналіз крыніцазнаўчай базы. З ім можна цалкам пагадзіцца ў тым, што "вывучэнне праблемы навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя адносіцца да адной з найменш даследаваных у беларускай гістарыяграфіі праблем" [1, с. 24]. У рэцэнзуемай манаграфіі здзейснены сапраўдны прарыў у дадзеным пытанні, аб чым сведчаць другая, трэцяя і чацвёртая главы.

Другая глава прысвечана аналізу палітыкі дзяржавы ў адносінах да дзейнасці інтэлігенцыі ў Беларусі. Аўтар паказаў, што "яе змест пераважна складала паскарэнне русіфікацыі краю" [1, с. 28]. Разам з тым А.І. Багдановіч удакладняе, што "вынікі гэтай палітыкі ў многім залежылі ад спецыфікі дзейнасці мясцовай і прысланай сюды з унутраных губерній Расіі інтэлігенцыі, якая не заўсёды адпавядала ідэалагічным запатрабаванням урада" [1, с. 53].

Мінскі беларусазнаўца не выявіў ніводнага факта, які б сведчыў аб тым, што "ўрад… перашкаджаў даследаванням у галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук" [1, с. 51]. Канешне, прадукцыйнасць прадстаўнікоў гэтых навук залежыла перш за ўсё ад капіталаёмістасці даследчыцкага працэсу. Датычна дадзеных навук існавала вялікая праблема, бо "ўрад… не аказваў фінансавай падтрымкі іх развіццю" [1, с. 51].

З дакладнасцю, наадварот, можна ахарактарызаваць становішча, у якім апынуліся суб'екты навуковага пошуку ў навуках, якія ўваходзілі ў сацыяльна-гуманітарны цыкл. Улады прад'яўлялі ім жорсткі сацыяльны заказ: "ідэалагічна абгрунтаваць "рускасць" беларускіх зямель" [1, с. 52]. Менавіта за гэта ім "выдзяляліся пэўныя дзяржаўныя сродкі" [1, с. 51].

Пры звароце да трэцяй главы "Навуковая і вынаходніцкая дзейнасць інтэлігенцыі" не могуць не выклікаць цікавасць імёны такіх навукоўцаў, як "прафесары М.В. Рытаў і І.А. Сцёбут… Яны сталі заснавальнікамі беларускай сельскагаспадарчай навукі" 1, с. 59].

У даследаванні гісторыі айчыннай медыцыны парэформеннага перыяду А.І. Багдановіч выступіў піянерам. З кнігі можна даведацца аб тым, што "ў дарэвалюцыйнай Беларусі цэнтрамі навуковай медыцынскай думкі былі ўрачэбныя таварыствы, якія функцыянавалі ва ўсіх губернскіх гарадах. Урачы падтрымлівалі навуковыя сувязі з іншымі медыцынскімі таварыствамі і выдатнымі дзеячамі медыцыны ў Расіі і Еўропе, прымалі ўдзел у працы агульнарасійскіх з'ездаў" [1, с. 59]. Аўтар адкрывае для чытачоў імёны сур'ёзных айчынных даследчыкаў у галіне медыцыны С. Надпоржскага, А. Цехановіча.

Багдановіч паказвае, у якіх сферах былі "найбольш паспяховымі беларускія вынаходнікі" [1, с. 60]. Гэта – чыгунка, гадзінікавая справа, фатаграфія. Ён па-новаму асэнсоўвае спадчыну, якую пакінулі пасля сябе навукоўцы, якія былі сканцэнтраваны на праблемных комплексах, якія мелі месца ў навуках, якія належалі да сацыяльна-гуманітарнага цыклу. "Тагачасныя беларускія грамадскія і гуманітарныя навукі былі прадстаўлены імёнамі І. Насовіча, М. Доўнар-Запольскага, А. Ельскага, М. Нікіфароўскага, А. Семянтоўскага, Я. Карскага і многіх іншых" [1, с. 68].

Аўтар таксама паказвае адмоўны ўплыў на становішча беларускай навукі таго факта, што ў рэгіёне "не было больш-менш значных навуковых цэнтраў і ВНУ" [1, с. 71]. Каб было інакш, тая "шырокая

навукова-даследчыцкая праца, якая была разгорнута беларускай інтэлігенцыяй у 1861–1900 гадах па дакладных, прыродазнаўчых і гуманітарных навуках” [1, с. 71], была б больш выніковай.

Чацвёртая глава “Культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі” ўключае наступныя сюжэтныя лініі: 1) народныя чытанні; 2) дзейнасць у галіне тэатра; 3) стварэнне народных бібліятэк, чытальняў і кніжны гандаль; 4) арганізацыя нядзельных школ, адукацыйных і прафесійных курсаў.

Па першай сюжэтнай лініі навуковая навізна прасочваецца ў паказе сацыяльнага складу ініцыятараў народных чытанняў, матываў іх дзейнасці, у аналізе ролі фондаў папячыцельства ў арганізацыі дадзеных чытанняў. Па другой з узгаданых ліній ажыццёўлена піянерскае даследаванне музычна-драматычных гурткоў. Датычна трэцяй сюжэтнай лініі аўтар паказвае, што “народныя бібліятэкі, чытальні і гандаль кнігамі задавальнялі патрэбы народа ў друкаваным слове, пашыралі доступ маламаёмасных слаёў гарадскога і сельскага насельніцтва да важнейшых на той час крыніц навуковай, культурнай і масавай інфармацыі: кніг, часопісаў і газет. Бібліятэкі з’яўляліся важным сродкам павышэння культурнага і інтэлектуальнага ўзроўню людзей і адным са спосабаў адцягнення людзей ад карчмы” [1, с. 94]. Па чацвёртай з аналізуемых ліній А.І. Багдановіч арыгінальны і пераканаўчы ў аналізе эвалюцыі падыходу ўладаў да нядзельных школ.

У заключэнні падводзяцца вынікі даследавання. З гэтых вынікаў мэтазгодна вылучыць тыя, якія даюць падставы для складання абагульняючага партрэта беларускай інтэлігенцыі.

Першы вынік тычыцца падлікаў “колькаснага росту інтэлігенцыі. У Беларусі яна ўзрасла з 1861 па 1897 год больш, чым у два з паловай разы (з 20 342 да 54 369 чалавек), і склала 2,6 % эканамічна актыўнай часткі насельніцтва. Гэты працэнт быў крыху ніжэйшым за сярэднерасійскі паказчык (2,7 %)” [1, с. 121].

Другі вынік – вызначэнне “адукацыйнага ўзроўню… У 1897 годзе толькі 10,8 % з 54 369 прадстаўнікоў інтэлігенцыі мелі вышэйшую ўніверсітэцкую, тэхнічную і ваенную адукацыю, 19,2 % – сярэднюю спецыяльную, а астатнія закончылі агульнаадукацыйныя поўныя і няпоўныя сярэднія школы” [1, с. 121].

Трэці вынік – дакладная градацыя па “сацыяльнаму паходжанню… У сацыяльным складзе пераважалі прадстаўнікі дваранства. Яны складалі палову ад усей інтэлігенцыі (49,7 %), астатнія паходзілі ў асноўным з купцоў, мяшчан і тых, хто не належаў да асноўных саслоўяў. Выхадцы з сялян складалі толькі 6,3 %” [1, с. 121–122].

Чацвёрты вынік – тлумачальны разбор этнічнай структуры. Грунтам для адпаведнага даследчыцкага працэсу сталі дадзеныя, атрыманыя ў час “усерасійскага перапісу насельніцтва 1897 года. Больш за трэць інтэлігенцыі ў Беларусі складалі велікаросы, больш за чвэрць – яўрэі, каля чвэрці – беларусы, 9,6 % – палякі” [1, с. 122]. Трэба адзначыць, што аўтар не пазбягае вострых пытанняў датычна тытульнага этнасу – беларусаў. Ён паказвае, што “нацыянальны склад інтэлігенцыі ў значнай ступені не супадаў з колькасным складам насельніцтва беларускіх губерній, у якім беларусы складалі больш за 73 %, а велікаросы толькі 4,4 %” [1, с. 122]. Аўтар капітальна тлумачыць, чаму была “нязначнай роля беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі ў навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці ў родным краі” [1, с. 122].

Структурны кампанент “Літаратура” [1, с. 131–144] утрымлівае 212 найменняў. Яго можна градзіраваць наступным чынам: 1) архіўныя крыніцы, якія ўпершыню ўведзены ў навуковае абарачэнне А.І. Багдановічам; 2) надрукаваныя дакументы і матэрыялы; 3) уласныя працы аўтара кнігі; 3) працы яго калег. Па першай частцы ўзгадваюцца 44 крыніцы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі [1, с. 137–139], 8 крыніц з Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва [1, с. 142]. Усе 53 кнігі, якія супадаюць з другой часткай, можна знайсці толькі ў аддзелах рэдкіх кніг розных бібліятэк. Іх выданне датуецца дарэвалюцыйным часам. Абсалютная большасць дадзеных кніг убачыла свет якраз у парэформенны перыяд. Датычна 9 прац А.І. Багдановіча, якія ўвайшлі ў трэцюю частку, трэба заўважыць наступнае. Самая ранняя з іх датуецца 2000 годам. Гэта азначае, што навукоўца ужо без малага паўтара дзесяцігоддзя распрацоўвае аналізіруемую праблематыку. Тут названы далёка не ўсе працы аўтара на прадмет навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці інтэлігенцыі Беларусі (1861–1900 гг.). Чацвёртая частка ўключае працы, якія выдаваліся з другой паловы XIX да пачатку XXI стагоддзя.

Змест апошняга структурнага кампанента ўтвараюць чатыры дадаткі [1, с. 145–151]. Усе яны выяўлены аўтарам у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску.

Кніга А.І. Багдановіча абавязкова зацікавіць адукацыйнае і навуковае супольніцтва. Яе з вялікай карысцю для сябе могуць скарыстаць спецыялісты ў галіне гісторыі, культуралогіі і іншыя.

ЛІТАРАТУРА

1. Багдановіч, А.І. Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі Беларусі (1861–1900 гг.) / А.І. Багдановіч. – Мінск: БНТУ, 2012. – 153 с.

***В.М. Стралец, д-р гіст. навук, праф.,***
***прафесар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта***